ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

№ 21 (816) • Чацвер, 3 чэрвеня 1971 г. • Цана 2 кап. • Год выдання XXIV

## ВЕСТКІ З БІЯФАКА

Амаль кожны дзень у гэты напружаны сесійны час пачынаецца з абароны дыпломных работ. Батанікі, фізіёлагі раслін, мікрабіёлагі, маладыя спецыялісты іншых профіляў, якія хутка прыступяць да самастойнай працы, пакуль што даюць справаздачу сваім выкладчыкам. Яны дэманструюць не толькі атрыманыя ва універсітэце веды, але і ўменне весці навуковыя даследаванні, эфектыўна звязваць іх з патрэбамі вытворчасці.

Пакуль што пераважнай большасці выпускнікоў спадарожнічае поспех.

⊙

Завочнікі біяфака І і ІІ курсаў закончылі практыку і рыхтуюцца да экзаменацыйнай сесіі, а вячэрнікі І, ІІ, ІІІ курсаў толькі пачалі практычны этап вучобы.

⊙

Кожны ранак ад пад'езда вучэбнага корпуса, дзе размешчан біялагічны факультэт, адыходзіць машына з групай студэнтаў. Шлях іх — у вучэбную гаспадарку Шчомысліца. Тут студэнты працуюць у батанічным садзе, даглядаюць пасевы, выконваюць шмат сезонных работ.

## НЕ ЗАДАВАЛЬНЯЮЧЫСЯ ДАСЯГНУТЫМ

*ПАРТЫЙНАЕ ЖЫЦЦЁ*

У партыйных арганізацыях БДУ завяршаецца справаздачна-выбарная кампанія. Камуністы на сваіх сходах падводзяць вынікі гадавой працы, аналізуюць дзейнасць партыйных бюро, вызначаюць задачы на наступны перыяд дзейнасці.

На сходзе камуністаў факультэта журналістыкі сакратар партыйнага бюро М. Е. Дастанка падкрэсліў, што ў цэнтры ўвагі партыйнай арганізацыі знаходзіліся пытанні дастойнай падрыхтоўкі да XXIV з'езда КПСС. Яшчэ ў кастрычніку на партыйным сходзе былі разгледжаны канкрэтныя сацыялістычныя абавязацельствы кафедр, усяго калектыву факультэта і намечаны шляхі іх паспяховага ажыццяўлення.

Пасля апублікавання праекта Дырэктыў на новае пяцігоддзе на партыйным сходзе быў заслухан даклад дэкана факультэта Р. В. Булацкага аб задачах калектыву ў святле намечаных планаў. Своечасова былі абмеркаваны вынікі выканання сацыялістычных абавязацельстваў.

Актыўная падрыхтоўка да з'езда дапамагла калектыву дабіцца значных поспехаў у вучэбна-выхаваўчай і навукова-даследчай рабоце. Так, па выніках зімовай сесіі факультэт выйшаў на першае месца ва універсітэце. Вялікая ўвага ўдзялялася павышэнню якасці падрыхтоўкі будучых журналістаў, іх ідэйна-тэарэтычнага ўзроўню, набыццю студэнтамі навыкаў журналісцкага майстэрства. У гэтай сувязі асобным клопатам стала паляпшэнне дзейнасці куратараў груп. Адпаведна плану работы з куратарамі былі праведзены інструктыўна-метадычныя нарады, на пасяджэннях партыйнага бюро заслухоўваліся справаздачы куратараў.

Партыйная арганізацыя сумесна з дэканатам асобую ўвагу звярнулі на тое, каб студэнты-камуністы паказвалі прыклад у вучобе і дысцыплінаванасці.

У гэтым годзе на кожным курсе, акрамя чацвёртага, былі створаны партыйныя групы, якія рабілі дабратворны ўплыў на студэнцкае асяроддзе.

Добрым памочнікам партыйнай арганізацыі стаў насценны друк. Акрамя факультэцкай, насценныя газеты рэгулярна выходзяць на курсах і нават у групах. На пасяджэннях партыйнага бюро разглядаліся пытанні аб рабоце рэдкалегіі, змесце і перыядычнасці выпуску факультэцкай газеты.

Самы актыўны ўдзел прынялі камуністы ў правядзенні Ленінскага заліку.

Клопатам партыйнага бюро было і павышэнне эфектыўнасці навуковых даследаванняў, паляпшэнне навукова-педагагічнай падрыхтоўкі выкладчыцкіх кадраў. І тут ёсць пэўныя зрухі. У гэтым годзе паспяхова абараніў доктарскую дысертацыю дэкан факультэта Р. В. Булацкі, завяршыў вялікі аб'ём даследаванняў і падрыхтаваў доктарскую дысертацыю загадчык кафедры дацэнт М. Я. Цікоцкі, кандыдацкія дысертацыі падрыхтавалі тт. Говін, Слука, Дубовік.

У дакладзе гаварылася і аб тых недахопах, якія яшчэ бытуюць на факультэце, і аб тым, што робіцца для іх выкаранення. Так, у мінулым годзе асобныя студэнты парушылі тэрмін практыкі, а некаторыя выкладчыкі не знайшлі час выехаць у камандзіроўкі і пацікавіцца справамі студэнтаў. Вось чаму адзін з адкрытых партыйных сходаў вырашана было прысвяціць спецыяльна пытанням практыкі. Сёлета падрыхтоўчы перыяд напярэдадні практыкі прайшоў больш арганізавана і мэтанакіравана.

Больш патрабавальнасці прад'яўлялася да парушальнікаў дысцыпліны і тых студэнтаў, якія зрабілі амаральныя ўчынкі. Студэнт Астапаў не дапушчан да абароны дыпломнай работы і да здачы экзаменаў. Выключаны з універсітэта чатыры старшакурснікі.

Выступіўшыя ў спрэчках камуністы выкладчыкі тт. Квочкін, Жураўлёў, Дубовік, дэкан т. Булацкі, студэнты Смольскі, Міхальчанка, аспірант Ермашкевіч дапоўнілі даклад і выказалі цікавыя думкі і прапановы па ўдасканаленню вучэбнага працэсу, наладжванню ўзорнай дысцыпліны, лепшай арганізацыі навуковай работы і дзейнасці студэнцкіх грамадскіх арганізацый.

А. АЛЕНІЧ.

## ПАД АДКРЫТЫМ НЕБАМ

З першымі цёплымі днямі пачынаецца вучэбная і вытворчая практыка студэнтаў-географаў. У палявых умовах на прасторах роднай краіны і за мяжой будучыя географы правяраюць і замацоўваюць веды, атрыманыя ў аўдыторыях. Як і ў мінулыя гады, яны пройдуць практыку па геадэзіі, гідралогіі, метэаралогіі, геалогіі, геамарфалогіі, геабатаніцы, паедуць на комплексную фізіка- і эканомікагеаграфічную практыку. Многія студэнты выязджаюць на пераддыпломную практыку ў саставе геалагічных, геафізічных і глебавых атрадаў і экспедыцый на раўніны Беларускага Палесся, на азёры Паўночнай Беларусі.

У практыцы гэтага года ў параўнанні з мінулым нямала новага. Геаграфічнаму факультэту адведзена новая апорная база ў Валожынскім раёне на маляўнічым высокім беразе Нёманскай Беразіны. Тут ужо разгарнулася будаўніцтва службовых памяшканняў для геаграфічнай станцыі. Будаўніцтва вядзецца сіламі саміх студэнтаў пад кіраўніцтвам дацэнта кафедры геадэзіі і картаграфіі Р. А. Жмойдзяка.

Змяніліся і маршруты летніх вытворчых практык і экскурсій. Упершыню ў гэтым годзе студэнты паедуць па ўральскіх маршрутах. Асноўная ж частка студэнтаў III курса ў адрозненне ад мінулых год накіроўваецца на вытворчую экскурсію па паўночнаму маршруту праз Прыбалтыку, Ленінград, Карэлію ў Мурманск, на Беламор'е, Архангельск і Паўночную Дзвіну. Тут менш экзотыкі ў параўнанні з Крымам і Каўказам, затое якія багатыя магчымасці для вывучэння геаграфічных заканамернасцей!

Першыя групы студэнтаў ужо выехалі ў поле. У сярэдзіне чэрвеня амаль увесь шматлюдны калектыў студэнтаў геаграфічнага факультэта раз'едзецца па месцах практыкі, каб пашырыць і паглыбіць свае веды, пазнаць геаграфічныя заканамернасці, якія нельга спасцігнуць толькі ў аўдыторыі і бібліятэцы.

В. ЖУЧКЕВІЧ,
намеснік дэкана геаграфічнага факультэта.

## У ГОРАДЗЕ МАЛАДОСЦІ І СЛАВЫ

*(Працяг. Пачатак у №№ 19, 20).*

Салігорск — падлетак. Яму ўсяго 13 год. Нарадзіўся горад з нараджэннем новай прафесіі, якая спачатку так нязвыкла гучала: беларускія шахцёры. У горада шчаслівы лёс. Яго славе можа пазайздросціць самы старажытны горад. Аб Салігорску, дзе быў пастаўлен сусветны рэкорд, ведаюць далёка за межамі нашай краіны.

Калі пад'язджаеш да Салігорска з боку Слуцка, здалёк відаць магутныя карпусы камбіната, горы адпрацаванай пароды. Тут здабываюць «камень урадлівасці», з якога хімікі атрымліваюць каштоўнейшыя калійныя ўгнаенні.

Цэнтральная вуліца Салігорска — шырокая і светлая, абсаджаная дрэвамі. Маладымі, як і сам горад. Дамы шасціпавярховыя. Новыя. Жывуць у іх маладыя сем'і шахцёраў. Сярэдні ўзрост жыхароў Салігорска — 24—25 год. У горадзе пяць сярэдніх школ. Будуецца шостая на 900 месцаў.

Славіцца горад шахцёрскі не маладосцю сваёй, не тым, што нарадзілася тут новая прафесія, а працоўнымі дасягненнямі. Салігорцы з гонарам называюць імёны Героя Сацыялістычнай Працы Віктара Канстанцінавіча Бабіча, брыгадзіра Леаніда Адамавіча Калініна, маладога шахцёра Станіслава Казакевіча.

Брыгада шахцёраў, якой кіруе камуніст Л. А. Калінін, у гонар XXIV з'езда КПСС узяла абавязацельства прайсці ў студзені 1971 г. 3.200 пагонных метраў (норма 850). Прайшла 3.815! Такога рэкорду не ведаў ніхто. Сапраўдныя волаты жывуць на зямлі тваёй, Беларусь!

3.815 метраў горнай выпрацоўкі — гэта 65 тысяч тон руды — на 10 цяжкавагавых цягнікоў. Хімікі выпрацавалі з руды 22 500 тон калійных угнаенняў, якія дадуць магчымасць атрымаць дадаткова 200 тысяч тон зерня ці амаль 667 тысяч тон бульбы. Такая сіла хіміі і такія багацці ў зямлі беларускай...

55 працэнтаў усіх калійных солей Савецкага Саюза дае Салігорск. У дзевятай пяцігодцы лічба гэта вырасце да 70 працэнтаў. Прадукцыя Салігорска ідзе ва ўсе краіны сацыялістычнага лагера. Аб усім гэтым паведаміў нам сакратар гаркома партыі т. Міхаленя. Мы пачулі ад яго і добрыя словы аб выпускніках нашага універсітэта, якіх толькі ў адным горадзе больш за сто. Сакратар пацікавіўся, ці няма сярод нас хімікаў, і горача запрашаў у Салігорск, дзе так патрэбны іх рукі і веды. У знак пашаны да Беларускага універсітэта нам уручаецца шлем з надпісам «Удзельнікам агітпрабегу «БДУ-50» ад шахцёраў Салігорска» і шахцёрская лямпа. Мы шчыра дзякуем і з хваляваннем чакаем галоўнага: ці дазволяць апусціцца ў шахту? Хваляваліся дарэмна.

...Мы на тэрыторыі другога рудаўпраўлення камбіната «Беларуськалій». Спачатку, у кабінеце сакратара парткома, мы пачулі расказ аб Герою Сацыялістычнай Працы В. К. Бабічу. Яго брыгада ездзіла на Урал на паказальныя спаборніцтвы. У абсалютна аднолькавых умовах брыгада Бабіча прайшла 32 пагонныя метры, а сапернікі ўсяго толькі 8 метраў...

У другім кабінеце, дзе звычайна праводзяцца планёркі і вытворчыя нарады, плакат з надпісам: «За пяць хвілін можна выкласці самую складаную думку. Спачатку кароткім сказам скажыце галоўную сутнасць. На гэта выкарыстайце 1 хвіліну. Потым давайце каментарыі і лічбы. На гэта — 4 хвіліны. У заключэнне абавязкова зрабіце прапанову».

І гэта не толькі словы. Мы ўпэўніліся, як на самай справе улічваецца тут кожная хвіліна.

...Законы шахты строгія. Нас знаёмяць з тэхнікай бяспекі, паказваюць, як карыстацца самавыратавальнікам.

Пераапранаемся ў шахцёрскія спецоўкі і не пазнаём адзін аднаго. Шлемы, курткі, лямпы... Вядома, кожны хоча мець здымак на памяць. Прыйшлося добра папрацаваць нашаму фотакору Віктару Жуку.

Заходзім у клецьі... падаем уніз на глыбіню 460 метраў. Адчуванне, як пры пасадцы самалёта, толькі значна мякчэй, без штуршкоў і рэзкіх пераходаў.

*(Заканчэнне на 3-й стар.).*



*Вось яна, беларуская соль!*

*Удзельнікі агітпаходу ў «падземным царстве».*

## У ПРЫЁМНАЙ КАМІСІІ

**Праз некалькі дзён гарачая пара пачнецца для тых, хто збіраецца паступіць на завочны факультэт нашага універсітэта. Як паказваюць звесткі прыёмнай камісіі, на 31 мая было атрымана 1.478 заяў, у тым ліку на аддзяленне рускай мовы і літаратуры—141 на 75 месц, беларускай мовы і літаратуры — 159 (50), журналістыкі — 102 (50), гісторыі — 265 (100), філасофіі — 62 (25), правазнаўства — 498 (150), геаграфіі — 120 (75), біялогіі — 131 (50).**

**У конкурсным спаборніцтве выявяцца дастойныя заняць месца ва універсітэце, тыя, хто валодае трывалымі і глыбокімі ведамі.**



*На працягу навучальнага года шмат часу ў вучэбнай праграме адводзіцца практычным заняткам.*

*На здымку: студэнты IV курса ў кабінеце методыкі выкладання геаграфіі.*

*Фота Г. Марозава.*

# ЮБІЛЕЙНЫ ВЕЧАР

Як ужо паведамлялася, на прайшоўшым тыдні ў памяшканні Тэатра юнага гледача адбыўся ўрачысты сход, прысвечаны 10-годдзю падрыхтоўчага факультэта.

З дакладам аб 10-гадовым працоўным шляху калектыву выкладчыкаў і супрацоўнікаў выступіў дэкан факультэта дацэнт М. К. Гарбачоў.

Затым начальнік аддзела па навучанню замежных студэнтаў і зарубежных сувязях Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі БССР І. П. Прымачук павіншаваў калектыў факультэта з юбілеем і ўручыў Ганаровую грамату Міністэрства, якой узнагароджан падрыхтоўчы факультэт за дасягнутыя поспехі ў справе падрыхтоўкі высокакваліфікаваных спецыялістаў для зарубежных дзяржаў і ў сувязі з 10-годдзем з дня арганізацыі факультэта.

Шмат цёплых слоў у адрас выкладчыкаў, супрацоўнікаў і кіраўнікоў факультэта сказалі ў сваіх выступленнях былыя выпускнікі падрыхтоўчага факультэта аспірант Джон Флетчар (Гана), студэнт VI курса Мінскага медінстытута Аўгусцін Каліса (Руанда), студэнтка падрыхтоўчага факультэта выдатніца вучобы Во Тхі Хонг В'ет, студэнт фізічнага факультэта Дзін Ван Тхонг, прэзідэнт зямляцтва в'етнамскіх студэнтаў падрыхтоўчага факультэта Чан Куанг Кхай.

Прывітальны адрас факультэту ўручыў прэзідэнт гарадскога зямляцтва в'етнамскіх студэнтаў аспірант універсітэта Нгуен Куанг Мінь.

Адзін з першых выкладчыкаў факультэта, а зараз сакратар камітэта камсамола універсітэта В. І. Пракошын павіншаваў выкладчыкаў і студэнтаў з юбілеем і ўручыў Ганаровую грамату камітэта камсамола БДУ.

Прывітальныя адрасы ўручылі таксама загадчык кафедры рускай мовы Беларускага політэхнічнага інстытута В. Ф. Ляховіч і дэкан па навучанню замежных студэнтаў, аспірантаў і стажораў універсітэта дацэнт К. К. Герман.

Прадстаўнікі камсамольскіх арганізацый прадпрыемстваў-шэфаў Алег Рудамётаў (ад Мінскага трактарнага завода) і Раіса Скавыш (ад Мінскага камвольнага камбіната) уручылі факультэту памятныя сувеніры. Факультэт атрымаў шмат віншавальных пісем і тэлеграм.

Пасля ўрачыстай часткі адбыўся вялікі канцэрт мастацкай самадзейнасці, у якім прынялі ўдзел студэнты і выпускнікі падрыхтоўчага факультэта, студэнты і аспіранты асноўных факультэтаў універсітэта.

**М. ДЗЯДКОВА,**
**Р. ЛУЧАНОК,**
**метадысты падрыхтоўчага факультэта.**

# ПЕРАМОЖЦЫ КОНКУРСУ

**(Працяг. Пачатак у № 10).**

102 лепшыя работы студэнтаў Беларускага ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна аднесены аргкамітэтам Рэспубліканскага агляду навуковых работ 1970 года да першай катэгорыі. Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі БССР узнагародзіла дыпломамі першай ступені:

**В. Навуменка** (5 курс, фізфак) за работу «Даследаванне палярызацыйных інфракрасных спектраў крысталагідратаў хларыдаў уранілу». Навуковы кіраўнік — дацэнт **А. І. Камяк.**

**А. Мінько** (5, фізфак) — «Люмінесцэнцыя монакрысталу актывіраванага шасцівалентным уранам». Н. к. — дацэнт **А. І. Камяк.**

**С. Галецкага** (4, фізфак) — «Установка для няспыннага бескантактнага кантролю ізаляцыі провада». Н. к. — галоўны інжынер **І. Г. Ляонаў.**

*(Працяг на 3-й стар.).*

# АПОШНІ СТУДЭНЦКІ







Ля аўдыторыі — усхваляваныя, поўныя радасці юнакі і дзяўчаты Сёння пяцікурснікі - географы здаюць свой апошні дзяржаўны экзамен.

У другой групе ведаюць, што Іван Богдзель адказвае на экзаменах адным з першых. На гэты раз ён таксама не парушыў традыцыі. Іван выходзіць з аўдыторыі, і на яго адразу ж абрушваецца лавіна пытанняў: які білет трапіўся, як адказваў, які настрой у экзаменатараў (гэта ж таксама важна).

— Шчаслівы. Зноў пяцёрку атрымае,—сказала дзяўчына, на хвіліну адарваўшыся ад канспекта.

Так, Івана Богдзеля аднакурснікі лічаць шчаслівым: ён знайшоў сваё прызванне, сваю мару. Вядома, што на працягу пяці год студэнцтва хлопец упорна і сур'ёзна працаваў. І вось цяпер як выдатніка вучобы «падаючага надзеі» маладога спецыяліста пры размеркаванні пакінулі пры кафедры азёразнаўства. Іван бясконца рад, што атрымаў магчымасць пасля заканчэння універсітэта займацца комплексным вывучэннем азёр.

***

Але давайце заглянем у аўдыторыю. Экзаменацыйная камісія — (здымак унізе) старшы выкладчык М. К. Чартко, дацэнт В. В. Шчаглова, прафесар А. Г. Мядзведзеў, дацэнт Магілёўскага педагагічнага інстытута Н. С. Ратабельскі, дацэнт кафедры палітэканоміі У. І. Максін, загадчык кафедры геалогіі Д. М. Карулін — слухае адказ Наталлі Усцінавай (здымак уверсе злева).

Першае пытанне білета даволі складанае—«Тэндэнцыя пазыковага капіталу да паніжэння. Капітал і пазыковы працэнт».

Адказ Наташы лагічны, поўны, не патрабуе ўдакладнення, і студэнтка пераходзіць да наступнага пытання. Расказ пра матэрыяльна - тэхнічную базу камунізму Усцінава будуе ў асноўным на матэрыялах XXIV з'езда КПСС, новага пяцігадовага плана. Наташа з палёгкай уздыхае: здаецца, адказам задаволены.

Адзін за другім называюць студэнты нумар білета, адказваюць.

І вось усе збіраюцца разам: і выкладчыкі, і студэнты (здымкі справа).

Старшыня экзаменацыйнай камісіі Н. С. Ратабельскі абвяшчае вынікі:

— Валянціна Сцяпура — выдатна, Іван Богдзель — выдатна, Раіса Яцык—выдатна, Наталля Усцінава — выдатна...

Студэнты задаволены: ацэнены веды аб'ектыўна. Атрымана шмат выдатных і добрых адзнак.

У. І. Максін, які чытаў курс лекцый па палітэканоміі і вёў практычныя заняткі на геафаку, адзначае, што другая група V курса, бадай, самая моцная.

— У час падрыхтоўкі да семінараў і экзаменаў большасць студэнтаў настойліва працавала і глыбока цікавілася многімі пытаннямі прадмета, унікала ў іх сутнасць, старанна вывучала творы класікаў марксізму-ленінізму. Усё гэта і дало адпаведныя вынікі на экзамене.

***

Старшыня камісіі жадае далейшых жыццёвых поспехаў выпускнікам. Выказвае надзею, што тэарэтычныя веды, атрыманыя ва універсітэце, яны будуць паспяхова прымяняць на практыцы.

Вось і здадзен апошні студэнцкі экзамен. Хутка абарона дыпломных, і цяперашнія пяцікурснікі пакінуць родны універсітэт. Хочацца верыць, што і жыццёвыя экзамены гэтыя юнакі і дзяўчаты будуць вытрымліваць з гонарам.

**М. МАЦЕЙКА.**

Фота Д. ЧАХОВІЧА.







# ТУРЫСЦКІМІ СЦЕЖКАМІ

Ля вытокаў сівога Дняпра, ля берагоў Нарачы, на сцежках Бярэзінскага запаведніка і па партызанскіх сцежках Міншчыны прайшлі турысты нашага універсітэта ўжо сёлета. Фізікі і географы, журналісты і матэматыкі, гісторыкі і юрысты з рукзакамі за плячыма адмералі не адну сотню кіламетраў, сустрэліся з цікавымі людзьмі, расказалі пра сябе і універсітэт, якому ў кастрычніку спаўняецца 50 год, пра нашу сталіцу — двойчы ардэнаносны Мінск. Гутарылі і аб тым, што сёння займае ўвагу і натхняе на працоўныя подзвігі,— гістарычных рашэннях XXIV з'езда КПСС.

Відаць, ужо не знойдзеш у беларускім краі такіх мясцін, дзе б не пабывалі турысцкія атрады універсітэта. Іх сустракалі возера Палік, што на Барысаўшчыне, томскія краявіды, сінявокія азёры Нарачаншчыны.

Вось што расказваюць удзельнікі паходу па маршруту Мінск — Белаазёрск— Целяханы Лена Халупава і Таня Красікава:

— Шмат кіламетраў прайшлі мы. Убачылі многае. Выступілі з канцэртам у Спораўскай сярэдняй школе. Вучні і тыя, хто прыйшоў да нас на канцэрт, з цікавасцю праслухалі расказ аб нашым універсітэце, а затым і выступленні нашых майстроў сцэны, як потым мы іх называлі, Марка Брагінскага, Фімы Польсмана, Валеры Ліпцінскага, Ліды Санінай.

Выступленні турыстаў з канцэртамі і лекцыямі перад вучнямі школ і жыхарамі вёсак сталі ўжо традыцыяй. Ні адзін паход не праходзіць без іх. Так і ў майскіх паходах. Пра выступленні самадзейных артыстаў раскажуць вам Коля Варабей, Валерый Жаркоў, Вольга Бутрымовіч і іншыя кіраўнікі турысцкіх атрадаў. Добрая гэта традыцыя. І працягваць яе — гонар кожнага турыста БДУ.

Ужо далей, аж на самым чарнаморскім узбярэжжы пабывала група, якой кіравала студэнтка IV курса фізфака Валянціна Даўгучыц. Мясціны мужнасці і гераізму Севастопаля, непаўторныя краявіды Кара-Дага сталі маршрутамі іх паходу. Поўныя ўражанняў і з багатым матэрыялам фотапалявання вярнуліся студэнты Русецкая, Дзенісюк, Палевікоў і іншыя.

На першынстве рэспублікі па скалалазанню, якое праходзіла ў Крыме, выступала каманда спартыўнага таварыства «Буравеснік», у якую ўваходзяць спартсмены універсітэта. Гонар Беларусі абаранялі студэнты фізфака Галіна Ламака, яна ж і кіраўнік каманды, і Жэня Цішнін, матэматык Лена Чайкова і філолаг Грыша Кісялёў, студэнтка журфака Таня Засім і географ Ларыса Байко. І хоць нашы альпіністы не ўвайшлі ў тройку мацнейшых, яны паказалі добрыя вынікі па асобных відах спаборніцтваў.

Вясна ў гэтым годзе сапраўды спартыўная і турысцкая. Больш двухсот удзельнікаў паходаў сабрала яна. І гэта лічба расце з кожным новым этапам падарожжаў па неабсяжных прасторах рэспублікі і краіны. Лічба гэта радуе і засмучае кіраўнікоў універсітэцкага клуба турызму-альпінізму.

Больш паловы турысцкіх груп не мелі сапраўдных палатак і іншага рыштунку і задаволіліся тым, што атрымалі ў пунктах пракату. Гэта праблема ўжо не першы год хвалюе турыстаў. І нарэшце. вырашыць яе ўжо трэба.

Вярнуліся з паходаў турысты. Але ненадоўга адклалі яны свае рукзакі і зачахлілі палаткі. Наступіла лета, пара вялікіх паходаў па краіне, пара сустрэч з цікавым і карысным, з людзьмі працы і героямі легендарных дзён Кастрычніка і Вялікай Айчыннай вайны, якія сёння сумеснымі намаганнямі будуюць камуністычнае грамадства.

С. ЛІСОУСКІ,
студэнт журфака.

## НА КІНАСТУДЫІ «БЕЛАРУСЬФІЛЬМ»

адбыўся прагляд першых чатырох серый новага тэлевізійнага фільма «Руіны страляюць...», пастаўленага рэжысёрам Віталем Чацверыковым па сцэнарыю беларускіх пісьменнікаў Івана Новікава і Івана Чыгрынава. У аснову фільма пакладзены дакументальныя падзеі, якія расказваюць аб мужнасці і гераізме мінскіх падпольшчыкаў і партызан у гады Вялікай Айчыннай вайны.

# ТРАДЫЦЫІ ЖЫЦЬ!

*«Дружба» — гэтае слова гучала ў той вечар на рускай і іспанскай, беларускай і французскай мовах. Кажуць, што сустрэча, якая адбылася тры разы запар, становіцца традыцыйнай. Так, гэта праўда. Традыцыйнымі сталі вечары дружбы будучых журналістаў і філолагаў, якія вывучаюць іспанскую мову, з іспанскімі палітэмігрантамі. Савецкі Саюз, Беларусь, Мінск сталі для іх другой Радзімай, другім домам.*

*Калі ў залу кафэ «Адпачынак» увайшлі ўсім добра знаёмыя старыя сябры студэнтаў дацэнт інстытута замежных моў Хасэ Марыя Флорэс Фернандэс, Адэла Дэгальдо Рамера і яе дачка Авеліна Арыяс, зала ўзарвалася бурнымі апладысментамі. Разам з імі прыйшла і студэнтка з Францыі Жані Маганьоск, якая праходзіць стажыроўку на філалагічным факультэце БДУ. Сярод гасцей намеснік дэкана факультэта журналістыкі А. І. Раковіч і прадстаўнік Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі В. І. Гладышаў.*



*Першае слова госцю — удзельніку грамадзянскай вайны ў Іспаніі і Вялікай Айчыннай вайны, выкладчыку мовы і літаратуры Хасэ Марыі Флорэс Фернандэс. Сакратару партыйнай ячэйкі Камуністычнай партыі Іспаніі ў Мінску, члену КПСС ёсць што расказаць моладзі і аб сабе, і аб сябрах па зброі.*

*Аб барацьбе моладзі Іспаніі расказала прысутным член Камуністычнай партыі Іспаніі і Савецкага Саюза, былы кіраўнік адной з камсамольскіх арганізацый Іспаніі Адэла Дэгальдо Рамера, якая цяпер працуе на паліграфічным камбінаце імя Я. Коласа.*

*На чатырох мовах гучыць гімн дэмакратычнай моладзі. Цяпер слова маладым. Авеліна Арыяс — іспанка, нарадзілася ў нашай краіне. Увесь час яна марыла пабываць на радзіме сваіх бацькоў. Такая магчымасць прадставілася ёй у мінулым годзе. Іспанія вачамі савецкай дзяўчыны — так можна назваць расказ Авеліны. Аб прыродзе Іспаніі і яе людзях, аб сустрэчах з моладдзю і аб карыдзе расказвала яна. Авеліну многае здзівіла ў Іспаніі. Яна так і сказала: «У нас усё па-іншаму. Але іспанскі народ, нягледзячы на праследаванні, змагаецца за сваё заўтра. Я ўпэўнена — Іспанія будзе свабоднай, як і Савецкі Саюз».*

*З групай французскіх студэнтаў была ў Іспаніі Жані Маганьоск, якая падзялілася сваімі ўражаннямі аб наведанні гэтай краіны. На сваёй роднай мове Жані выканала некалькі песень.*

*І вось зала напоўнілася паэзіяй і музыкай. Свае вершы прачыталі Хасэ Марыя Флорэс Фернандэс і Уладзімір Трусаў, Людміла Забалоцкая прачытала свае пераклады вершаў Гарсіа Лоркі на беларускую мову.*

*Гучыць бадзёрая мелодыя іспанскага танца, які з вялікім майстэрствам выканалі Алена Скурко, Людміла Драпежа і Валянціна Церашкова. Іспанскія рытмы змяніла руская плясавая.*

*Сустрэча заканчваецца. Сябры развітваюцца. Прынята рашэнне: такія сустрэчы праводзіць кожны год. Традыцыі жыць!*

*Вечар удаўся на славу. Задаволены госці, задаволены і арганізатары: выкладчыкі замежнай мовы Я. А. Фернандэс, Н. Г. Будзінас, С. М. Любіч, студэнты Віктар Сахинкоў і Святлана Варзобава.*

А. СМОЛЬСКІ.




**НА ЗДЫМКАХ:** (уверсе) выступае намеснік дэкана журфака дацэнт А. І. РАКОВІЧ; (унізе) іспанскі танец выконваюць студэнткі філалагічнага факультэта Алена СКУРКО, Людміла ДРАПЕЖА і Валянціна ЦЕРАШКОВА.

Фота Т. Кацнельсон.

## НОВЫЯ ПАСТУПЛЕННІ Ў БІБЛІЯТЭКУ БДУ

Ключева, З. И. Идейное и организационное укрепление Коммунистической партии в условиях борьбы за построение социализма в СССР. М., «Мысль», 1970. 312 стр.

Локтев, В. П. «Политика КПСС в области управления социалистическим производством. Демократический централизм в управлении хозяйством. Единство хозяйственной, политической и воспитательной работы». Минск, «Беларусь», 1971. 39 стр.

Краснова, Н. Г. Партыйнае кіраўніцтва народнай асветай. Мінск, «Народная асвета», 1970. 256 стар.

Брежнев, Л. И. Отчетный доклад Центрального Комитета КПСС XXIV съезду Коммунистической партии Советского Союза. М., Политиздат, 1971. 135 стр.

Косыгин, А. Н. Директивы XXIV съезда КПСС по пятилетнему плану развития народного хозяйства СССР на 1971—1975 годы. Минск, «Беларусь», 1971. 79 стр.

Резолюция XXIV съезда Коммунистической партии Советского Союза по Отчетному докладу ЦК КПСС. Постановление XXIV съезда Коммунистической партии Советского Союза о частичных изменениях в Уставе КПСС. М., Политиздат, 1971. 32 стр.

У час летніх канікул на возеры Нарач будзе працаваць у дзве змены студэнцкі спартыўна-аздараўленчы лагер. Заявы на атрыманне пуцёвак падавайце ў прафбюро факультэтаў да 10 чэрвеня.

Х Х Х

Ленінградскі дзяржаўны універсітэт імя А. А. Жданава прапаноўвае пуцёўкі ў спартыўна-аздараўленчы лагер «Брыганціна» (г. Ленінград). Кошт пуцёўкі — 50 рублёў.

І змена — з 2 па 21 ліпеня

ІІ — з 22 ліпеня па 10 жніўня

ІІІ — з 11 па 30 жніўня.

Жадаючым набыць пуцёўкі звяртацца ў прафком БДУ (п. 205) да 10 чэрвеня.

ПРАФКОМ.

# Экзаменацыйныя дыялогі

— Як можна да такой ступені нічога не ведаць?

— Прабачце, прафесар, я думаў, што экзамен адбудзецца заўтра.

Х Х Х

Студэнт: А, можа, прафесар, над гэтым пытаннем разам падумаем? Розум добра, а два лепш.

Прафесар:..?

Х Х Х

— Ты чаму павесіў нос?

—Сесія на носе!

(З размовы двух студэнтаў).

Х Х Х

З адказам не атрымлівалася. Каб неяк выкруціцца, студэнт звярнуўся з просьбай:

— Дазвольце выйсці на піцца?

— Тонучы піць не просіць, — адказаў прафесар.

Х Х Х

Студэнт-медык экзаменаваўся ў прафесара Лагранта.

— Як вы паступіце, калі вам патрэбна, каб хворы добра прапацеў? — спытаў прафесар.

— Я дам яму моцнае патагоннае.

— Напрыклад?

— Гарачы чай, маліну, ліпавы цвет.

— Ну, а калі гэта не дапаможа?

— Я тады выкарыстаю лятучыя маслы, эфір...

— А калі гэтага будзе недастаткова?

— Я паспрабую ртутныя прэпараты...

— А калі дзеяння ўсё-такі не будзе?

Лоб студэнта пачынае пакрывацца кроплямі поту.

— Я пашлю хворага экзаменавацца да вас.

Рэдактар
А. А. НІКОЛЕНКА.

Наш адрас: г. Мінск, Універсітэцкі гарадок, галоўны корпус, п. 106. Т—22-07-19. Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі.
Зак. 964. АТ 15005